Статья в журнале «Родная природа»


Статья «Марафон на ашчаднасць» об учащихся нашего колледжа в научно-популярном журнале «Родная природа» (октябрь 2023)

Родная прырода

10
2023

6+

грамадска-палітычны, навукова-папулярны часопіс



РАСПЛЕСКАЛА ОСЕНЬ КРАСКИ

ЮНЫ НАТУРАЛІСТ

№ 10 (115)



Для тысяч прыхільнікаў ашчаднага выкарыстання прыродных багаццяў у Беларусі гэтая восень пачалася з падрыхтоўкі да ўдзелу ў XVII Рэспубліканскім конкурсе «Энергамарафон». Яго сутнасць у папулярызаванні каштоўнасцяў энергаэфектыўнасці сярод старэйшага і маладога пакаленняў, а таксама ў пашырэнні паспяховага досведу навучальных устаноў у галіне энергазберажэння.

МАРАФОН НА АШЧАДНАСЦЬ

Уладзімір [illegible]САКОВІЧ

Фота з архіва Магілёўскага электратэхнічнага каледжа

Арганізатарамі агульнанацыянальнага спаборніцтва выступаюць Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі і Міністэрства адукацыі Беларусі. Пералік магчымых удзельнікаў даволі шырокі. Ён ахоплівае як выхаванцаў дзіцячых садкоў, навучэнцаў школ і каледжаў, так і іх настаўнікаў, выхавальнікаў.


Рэспубліканскі конкурс «Энергамарафон» праводзіцца з 2016 года. Сёлета да ўжо традыцыйных намінацый, такіх як «Праект практычных мерапрыемстваў па энергазберажэнні, энергаэфектыўнасці і аднаўляльнай энергіі», «Культурна-відовішчнае мерапрыемства па прапагандзе эфектыўнага і рацыянальнага выкарыстання энергарэсурсаў», «Мастацкая праца па прапагандзе эфектыўнага і рацыянальнага выкарыстання энергарэсурсаў» і «Сістэма адукацыйнага працэсу і інфармацыйна-прапагандысцкай работы ў сферы энергазберажэння ва ўстанове адукацыі», дадалі яшчэ дзве – «Гейміфікацыя ў энергазберажэнні» і «Найлепшы педагагічны працаўнік па арганізацыі працы па выхаванні культуры рэсурса- і энергазберажэння ў навучэнцаў». Намеснік начальніка ўпраўлення прававой, кадравай і арганізацыйнай працы Дэпартамента па энергаэфектыўнасці **Алена ПАШЭВІЧ** паведаміла, што «Гейміфікацыя ў энергазберажэнні» разлічана на дадатковую папулярызацыю конкурсу сярод падлеткаў і ўключае тры паднамінацыі: «Дыдактычная гульня», «Настольная гульня» і «Камп'ютарная гульня». Работы павінны быць упершыню распрацаванымі і аўтарскімі.

Аднак галоўнай намінацыяй заслужана лічыцца «Праект прак-



Мікіта КАЛІСТРАТАЎ (справа) з кандыцыянерам «Белкамфорт+»





Q – выключальнік, K – рэле часу, HL – бактэрыцыдная лямпа, L – фаза, N – нуль, T – павышальны трансфарматар, F – выпраменьвальнік генератара азону, M – вентылятар

Схема падключэння складовых элементаў кандыцыянера «БЕЛКАМФОРТ+»

тычных мерапрыемстваў па энергазберажэнні, энергаэфектыўнасці і адноўляльнай энергіі». Летась перамогу ў ёй здабыў **Мікіта КАЛІСТРАТАЎ**, навучэнец Магілёўскага электратэхнічнага каледжа, з распрацоўкай кандыцыянера «Белкамфорт+», якую магчыма назваць адной з найбольш практыка-арыентаваных за ўсю гісторыю спаборніцтва. Ахалоджванне паветра дасягаецца за кошт цыркуляцыі халоднага паветра і вады ўнутры прылады. Закладзены ў канструкцыю генератар азону дае на выхадзе яго канцэнтрацыю 0,15 мг/м^3 – як пасля навальніцы. Мініяцюрнасць і выцягнутая форма кандыцыянера дазваляюць усталяваць яго як на сцяне ўнутры памяшкання, так і ў вентыляцыйнай шахце. Кіраванне ажыццяўляецца праз смартфон пры дапамозе вайфай-рэле.

Таннасць тэхнічнага ўвасаблення (сабекошт – 620 руб.) і нізкае энергаспажыванне (173 Вт – у чатыры разы менш, чым у прамысловых аналагаў) праекта выклікалі настолькі высокую зацікаўленасць, што Дзіцячы фонд ААН выдаў грант на яго распрацоўку, па выніках якой каледж падаў заяўку на патэнт у «Белпатэнтсэрвіс».

Яшчэ адно цікавае вынаходніцтва леташняга конкурсу – зарадны зэдлік «Паўэр Банк», створаны навучэнцам Палескага аграрнага каледжа **Паўлам КЯЦКОМ**. Гэтая прылада дае магчымасць зарадзіць смартфон без разеткі – яна вырабляе электрычнасць за кошт рухаў чалавека пры дапамозе ўбудаваных у куты сядзення дынамічных генератараў. Дадзеная распрацоўка заняла 3-е месца.

Традыцыйная намінацыя «Энергамарафону» ўключае культурна-відовішчныя мерапрыемствы, такія як песні і сцэнічныя выступленні. Асобная намінацыя прысвячаецца мастацкім творам і разглядаецца журы ў дзвюх паднамінацыях «Відэаролік» і «Улётка, плакат, малюнак». Урэшце, на конкурсе прынята ацэньваць адукацыйны працэс і інфармацыйна-прапагандысцкую працу ў навучальных установах.

Як заўважыла Алена Пашэвіч, спаборніцтва штогод прыцягвае звыш 2500 удзельнікаў з усёй краіны. Летась канкурсанты прадстаўлялі амаль 500 навучальных устаноў. Ужо адзін гэты факт дазваляе звярнуць увагу шырэйшай грамадскасці на распрацоўку практычных захадаў у галіне энергаашчаднасці ў побыце, а таксама на развіццё метадаў экалагічнай асветы.

Адборачная частка спаборніцтва звычайна ладзіцца з кастрычніка 2023 па студзень 2024 года. У гэты час на абласным і сталічным узроўнях упраўленні па адукацыі і наглядзе за рацыянальным выкарыстаннем паліўна-энергетычных рэсурсаў прымаюць творы праз аргкамітэты «Энергамарафону». Пры гэтым конкурсная праца можа быць асабістай і супольнай. Навучэнцам як непаўналетнім у якасці кіраўніка сваёй працы варта назначыць прадстаўніка з кола педагогаў ці бацькоў. Акрамя таго, патрэбна прыкласці заяўку, у якой пазначаецца намінацыя і назва навучальнай установы.

Заключная частка конкурсу пройдзе з лютага па красавік 2024 года. Узнагароджанне пераможцаў на рэспубліканскім узроўні па чарзе адбываецца ў кожнай вобласці Беларусі. На гэты раз цырымонія плануецца ў Гомелі. Прызёры, якія зоймуць 1–3 месцы, атрымаюць дыпломы Дэпартамента па энергаэфектыўнасці. Пасля вызначэння пераможцаў пройдзе рэспубліканская выстава конкурсных прац.

Агульная працягласць спаборніцтва амаль супадае з навучальным годам, што дазваляе сотням задзейнічаных устаноў адукацыі прыцягнуць багата дзяўчат і юнакоў да экалагічнай асветы з практычнымі вынікамі. Павелічэнне колькасці намінацый, магчыма, стане добрай нагодай для пашырэння ўзроставага складу ўдзельнікаў, а высокі ўзровень распрацовак прызёраў задасць тон для здаровай канкурэнцыі наступных пакаленняў экавынаходнікаў. ■